# У абарону роднай зямлі

## Мая Радзіма — Беларусь. IV клас

***Мэта:*** напрыканцы ўрока вучні павінны ведаць асноўныя падзеі, звязаныя з грунвальдскай бітвай і ўмець вызначаць паслядоўнасць гістарычных падзей.

***Задачы:***

• стварыць умовы для пашырэння ведаў вучняў аб існаванні Вялікага Княства Літоўскага, аб князях і іх праўленні, аб падзеях 1410 года;

• спрыяць развіццю ўмення працаваць з гістарычнай картай, выхаванню любові да Радзімы, пачуцця гераізму і адвагі;

• развіваць у вучняў цікавасць да гістарычнага мінулага нашай Радзімы.



***Абсталяванне:*** мультымедыйная прэзентацыя; карты, атласы; «кніжкі даследчыкаў», заданні на картках.

***Падрыхтоўчая работа:*** вучні дома праглядваюць вучэбнае відэа і адказваюць на пытанні (гл. эл. дадатак).

**1. Арганізацыйны этап.**

Празвінеў званок вясёлы,
У клас пазваў усіх дзяцей.
Будзем дружна працаваць,
Веды будзем здабываць.
Вы да працы ўсе гатовы?

***Слайд 1.***

— Пачаць наш урок хачу народнай прыказкай (***слайд 2***):

*Навука для чалавека, як сонца для жыцця.*

— Як вы разумееце народную мудрасць?

— Усяму жывому патрэбна сонца, без яго няма жыцця. Кожнаму чалавеку патрэбны веды. Чалавек сваім розумам можа шмат зрабіць для іншых, як нашыя славутыя продкі: Францыск Скарына, Сымон Будны, Кірыл Тураўскі, Ефрасіння Полацкая, Яраслаў Мудры. У адукаванага чалавека цікавае жыццё.

**2. Этап актуалізацыі суб'ектыўнага вопыту.**

— Сёння на ўроку я прапаную вам пабыць у ролі гісторыкаў-даследчыкаў, звярнуцца да падзей мінулага.

***Слайд 3.***

— Якую гістарычную падзею мы будзем даследаваць, вы павінны былі выявіць дома. *(Грунвальдскую бітву.)*

***Слайд 4.***

— Мы будзем весці гаворку пра Грунвальдскую бітву. Тэма наша ўрока — «У абарону роднай зямлі».

***Слайд 5.***

— Якую мэту мы павінны паставіць?

*Ведаць асноўныя падзеі, звязаныя з Грунвальдскай бітвай, і ўмець вызначаць паслядоўнасць гістарычных падзей.*

*Задачы:*

*Вызначыць, якая небяспека пагражала беларускім землям; як нашы продкі змагаліся з крыжакамі і татарамі; ролю Грунвальдскай бітвы ў гісторыі.*

**3. Этап прымянення ведаў.**

— Каб наша праца была плённай, у кожнага з вас ёсць невялікія кніжкі даследчыкаў (гл. эл. дадатак). Яны будуць дапамагаць нам у працы. Я прапаную кожнаму з вас узяць іх у рукі і адказаць на першыя пытанні. Правільна адказаць на пытанні вам дапамогуць веды, якія вы атрымалі падчас прагляду дамашняга відэароліка.

Вучні запісваюць адказы ў свае кніжкі. Самаправерка.

***Слайд 6.***

***Пытанні:***

1. Якое самае вялікае княства існавала з 13 па 18 стагодзе? *(Вялікае Княства Літоўскае.)*

2. Якая заходняя славянская дзяржава была суседкай Вялікага Княства Літоўскага? *(Польшча.)*

3. У склад якога княства ўваходзілі беларускія землі? *(Вялікае Княства Літоўскае.)*

4. Назавіце першую сталіцу Вялікага Княства Літоўскага. *(Навагрудак.)*

5. На паўночным захадзе ворагамі для зямель Вялікага Княства Літоўскага былі ... *(Рыцары Тэўтонскага ордэна, або крыжакі.)*

6. На паўднёвым усходзе ворагамі зямель Вялікага Княства Літоўскага былі ... *(Татары.)*

7. Якія беларускія гарады часцей за астатнія падвяргаліся набегам крыжакоў? *(Полацк, Гродна.)* (Чаму?)

***Слайд 7.***

На дошцы настаўнік размяшчае карту з межамі дзяржаў.

***Слайд 8.***

***Работа ў групах.***

Кожны ўдзельнік групы атрымлівае картку з тэкстам (гл. эл. дадатак). Трэба ўставіць словы па сэнсе, а потым аб'яднаць свае адказы ў адно паведамленне ад групы.

Група 1. Вялікае Княства Літоўскае.

Група 2. Польшча.

Група 3. Тэўтонскі ордэн.

Група 4. Татары.

Групы прэзентуюць свае работы. Самаправерка.

***Фізкультхвілінка.***

— Як вядома, гісторыкі-даследчыкі, каб здабыць карысныя звесткі, адпраўляюцца на пошукі ў розныя куткі зямлі. Мы з вамі не будзем выходзіць за межы класа, але правядзём пошукі.

Кожнай групе даецца «карта класа». Трэба па карце знайсці ў класе тое, што схавана, і даць адказ на пытанне «Якой дзяржаве гэта належыць?».

***Слайд 9.***

Гербы Вялікага Княства Літоўскага, Польшчы, Тэўтонскага ордэна, татар.

— З простай картай вы справіліся, а зараз паспрабуем папрацаваць з больш складанай картай.

***Работа з контурнай картай***, выкананне заданняў 1–3.

***Слайд 10.***

Самаправерка.

— Разгледзьце малюнкі ў атласе. Партрэт якога князя намаляваны? *(Вітаўта.)*

***Слайд 11.***

На слайдзе партрэты: Альгерд, Кейстут, Вітаўт, Ягайла.

— Устанавіце іх сваяцкія сувязі.




Узаемаправерка.

— Я прапаную вам узгадаць фрагменты вучэбнага відэа, а потым выканаць заданне: дапісаць словы ў сказы.

Прагляд відэа (фрагмента, гл. эл. дадатак.) (https://www.youtube.com/watch?v=Fu6vE0E_CfE)

Заданне.

*Кім быў Вайтыла пры двары?* ____________

*Князем ВКЛ быў* __________ *і* ____________ .

*Які замак атрымаў пекар пасля збліжэння з князем Альгердам?* ______________

*Пасля смерці Альгерда князем стаў яго* _____ .

*Супраць каго настройваў Вайтыла князя Ягайлу?* ____________

*На паўночна заходнім рубяжы размяшчаліся межы _______ ордэна. Першыя крыжакі тут з'явіліся ў _________ стагоддзі. З тых часоў вайна на мяжы не спынялася.*

*Вайтыла прыбыў да крыжакоў для сумеснага нападу на ________ і крыжакі ________ .*

*Змова Вайтылы была раскрыта і яго _______ .*

*Праз некаторы час Ягайла зноў сабраў войска і падманам захапіў у палон _________ і ________ . Кейстут быў ________ , а Вітаўт бег ________ .*

*Стаўшы каралём Польшчы Ягайла вырашыў забіць свайго брата Вітаўта. Вітаўту давялося зноў бегчы.*

*На мяжы для яго быў збудаваны замак ________ . Вітаўт заваёўваў суседнія землі, а слава пра яго расла. Аднойчы ноччу замак «Чорная цвярдыня» падпалілі. Былі забітыя жонка і дзеці Вітаўта. Крыжакі рыхтаваліся да вайны.*

*У ________ годзе Ягайла і Вітаўт сустрэліся на мяжы і пасля працяглай вайны аб'ядналіся для супрацьстаяння ____________ордэну.*

*Каля вёскі Грунвальд ________ ліпеня ________ года адбылася вырашальная бітва, якая ўвайшла ў гісторыю як __________ .*

Самаправерка.

— Грунвальдская бітва адбылася 15 ліпеня 1410 года. Ворагі сышліся на полі бою.

***Работа з контурнай картай,*** заданні 4, 5.

***Слайд 12.***

Самаправерка.

— Войска Вялікага Княства Літоўскага складалася з 12 000 воінаў, Польшчы — прыкладна столькі ж. Тэўтонскі ордэн — 18 000 воінаў. На падмогу прыйшлі рыцары з еўрапейскіх краін: Англіі, Францыі, Венгрыі і інш.

Паважаныя гісторыкі, вам трэба расставіць войскі на полі бою:

група 1 — войска Вітаўта;

група 2 — войска Ягайлы;

група 3 — войска крыжакоў;

група 4 — што стала пачаткам ваенных падзей? *(На рубяжы паказаліся крыжакі, яны прывезлі і ўручылі Вітаўту і Ягайле па мячу, што азначала «Пачынайце атаку, або вы баязліўцы».)*

***Слайд 13.***

— Дома вы малявалі карту Грунвальдскай бітвы, хто жадае нам расказаць аб ваенных падзеях? Хто хоча дапоўніць?

— Якія рысы характару воінаў прывялі іх да перамогі?

— Якую ролю адыграла перамога ў Грунвальдскай бітве?

— Перастаў існаваць галоўны вораг Вялікага Княства Літоўскага, Вялікае Княства Літоўскае стала магутнай дзяржавай.

***Слайд 14.*** Помнікі, якія паказваюць значнасць гэтай гістарычнай падзеі.

**4. Этап замацавання ведаў.**

— Прапаную вам прайсці іспыт на званне гісторыка-даследчыка.

***Тэст.***

1. Князем Вялікага Княства Літоўскага ў 13 ст. быў:

а) Ягайла; б) Вітаўт; в) Кейстут.

2. Ворагамі Вялікага Княства Літоўскага на межах былі:

а) крыжакі; б) Вайтыла; в) татары.

3. Беларускія землі ў 13 ст. уваходзілі ў склад:

а) Вялікага Княства Літоўскага;

б) Польшчы;

в) Тэўтонскага ордэна.

4. Грунвальдская бітва адбылася:

а) 10 ліпеня 1410 г.; в) 15 ліпеня 1410 г.

б) 9 ліпеня 1410 г.;

5. Галоўнае кіраванне боем узяў на сябе:

а) Ягайла; б) крыжакі; в) Вітаўт.

Без памылак — 3 балы, 1 памылка — 2 балы, больш за 1 памылку — 1 бал.

***Слайд 15.***

Праверка. Ключ: 1Б; 2А, В; 3А; 4В; 5В.

***Слайд 16.***

— Давайце падвядзём вынік нашай даследчай дзейнасці.

Падлічыць колькасць набраных балаў,
+ дадаць балы за тэст
= вынік — адзнака.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якую гістарычную падзею мы даследавалі?

— Ці дасягнулі пастаўленай мэты?

— На якія пытанні адказалі?

— Навошта мы даследавалі гістарычную падзею, якая адбылася 608 год таму назад?

**6. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

— Грунвальдская бітва пакінула вялікі след не толькі ў гісторыі, але і ў мастацтве, у літаратуры. Да наступнага ўрока вы даследуеце:

✓ Якія карціны напісаны мастакамі на гэту тэму?

✓ Якія творы апісваюць Грунвальдскую бітву?

✓ Якія кінастужкі зняты па матывах гэтай гістарычнай падзеі?

Акрамя таго спасылка на інтэрнэт-сайт:

Лев Сапега Великий канцлер Lew Sapieha LEV SAPEGA youtube.com

✓ Даведацца пра тое, хто такі Леў Сапега, і пра яго ролю ў гісторыі.

**7. Рэфлексія.**

— Мае паважаныя даследчыкі, давайце зноў звернемся да народнай мудрасці.

— Чаму вас сёння навучыла наша даследчая дзейнасць?

— Чым вы задаволены? Чым не задаволены?

***Слайд 17.***

— Жадаю вам, каб вашы веды з кожным днём пашыраліся і былі для вас тым сонечным праменем, які будзе дапамагаць у жыцці.

***Казачэнка В. Л.**, настаўніца*
*СШ № 11 г. Оршы Віцебскай вобласці*